Цэна асобнаго нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакціі і адміністраціі: **Вільня, Віленская вул., № 29.**

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес.—2 р. 3 мес.—1 р. Перамена адрэсу— 20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам с фаміліей,, хто нл захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рэдакція пакідае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год IX. 18 Сьнежня 1914 г. № 50

**Каб не было задзержкі у высылцэ газэты, просім прысылаць патпіску на 1915 г.**

## Сіла еднасьці.

Ад Бальційскаго мора да Чорнаго, на мяжы Расеі с Турэччынай, у Сэрбіі, Бэльгіі, на граніцы Франціі—скрозь ідзе страшэннае змаганьне між вялікімі эўропэйскімі дзержавамі.

Але сучасные дзержавы — гэта збор уселякіх націй. Дзесяткі народоў жывуць пад Расеей, Аўстрыей, Англіей, Турэччынай ды іншымі, і кожын народ дзержыцца сваей мовы спрадвечнай, мае свае асобные справы і патрэбы душы і цела, па свойму маліцца Богу. Ды не заўсёды на'т жыве ўся нація ў вадным гасударстві: часта яна падзелена між некалькіх суседоў. Гэтак палякі жывуць пад Расеей, Аўстрыей і Нямеччынай, украінцы — пад Расеей і Аўстрыей, армяне — на Каўказі і пад туркамі.

Вайна вялікіх дзержавоў, падняўшая суседа проці суседа, паставіла паляка расейскаго насупроць аўстрыяцкаго і нямецкаго, украінца з Расеі — супроць украінца з Галіччыны. Брат пайшоў на брата, бо і адны і другіе прымушэны ваеваць у арміі тэй дзержавы, у якой жывуць, ня гледзючы на тое, каму яны спагадаюць.

Гасударства злучыло народы і вядзе іх у бой. Але ёсьць ешчэ другая сіла, што зьвязывае ў вадну сям'ю людзей, каторые, нават жывучы побач, чулі сябе чужымі: сіла гэта—супольная беда, супольная руіна ад вайны. Гэта бачым і ў нашай старонцы.

У часі спакою — да вайны — ўсё-ж такі ў нашай старонцы ішлі національные сваркі і змаганьне. Націі, каторые панавалі над «мужыцкімі» народамі — беларускім і літоўскім, не хацелі уступаць мейсца новым сілам, што с тых народоў выходзячы дабіваліся належнаго мейсца ў так званых «вышэйшых» клясах грамадзянства. Але ў гэтым змаганьні за мейсцо многамільённая шэрая селянская грамада ў Літве і Беларусі была слаба зьвязана ў вадно. Цяпер, калі на літоўскі народ зваліўся найвялікшы ціжар вайны, калі сумежная с Прусамі часьць Сувальскай і Ковенскай губэрні зусім зруйнавана, — беларускіе селяне павінны памагчы гэтым братам сваім. Па гарадох думка аб такой помачы ўжо бойка шырыцца, і віленскіе беларусы маняцца скора наладзіць прэдстаўленьне — сыграць опэрэтку «Залёты» Марцінкевіча на карысьць сувальчан. Ніхай жэ яна пойдзе з гораду па сёлах, ніхай наш народ шчыра адгукнецца на горэ літвіноў, як ён ужо адгукнуўся на нешчасьця польскіх селян.

Мацней зьвязала вайна і жыдоў з літвінамі. Ешчэ даўней — калі адбываліся думскіе выбары, жыды заўсёды ішлі поруч з літоўскімі выбаршчыкамі-селянамі і памагалі ім пераважыць ды выбраць дэпутатамі шчырых заступнікоў народу. Цяпер жыды ахвотне прыкладаюць сваю руку да помачы пацярпеўшаму населенью Літвы, а ў Петраградзі, калі аткрываўся літоўскі камітэт, да яго прылучыліся і жыды, ў тым ліку ковенскі дэпутат Фрыдман. З шчырым словам зьвярнуўся ён да літвіноў: «Ваша беда — казаў Фрыдман — гэта наша супольная беда». А ў тым жэ часі віленскі літоўскі камітэт пастанавіў асыгнаваць з сваіх грошы 3,500 руб. на падмогу жыдоўскай беднаце ў Літве...

а—н—а.

# ВАЙНА.

**На Ўсходнім фронце** і гэты тыдзень не спыняліся крывавые і заўзятые бітвы расейскаго войска з немцамі і аўстрыякамі. У гэтым так званым Завісьлянскім, іначэй польскім районе расейскае войска заядла бараніло лінію *Бзуры, Равкі, Піліцы і Ніды.* Нямецка-аўстрыяцкае войска неатступна пёрлася перэрваць гэту лінію, напіраючы ўжо гэтым разам не абходамі, а цэлым радам атак проста ў фронт. У ночы з 9 на 10 сьнежня немцы ізноў перэбраліся цераз Бзуру у 5 верстах на поўнач ад Сохачэва, але тутака іх расейцы разьбілі. У гэту-ж самую ноч і праз увесь дзень 10 сьнежня немцы кідаліся колькі раз у заўзятые атакі у районе Болімова, але ўсюды былі адбіты агнём і проці-атакамі расейскаго войска. На берэгах Піліцы, ў районе Іновлодзя і ніжэй гэтаго пункта, не спыняліся вельмі крывавые бітвы, прычым расейцам удалося аткінуць немцоў перайшоўшых раней на правы берэг. На Нідзе 9 і 10 лістапада бітвы адбываліся па ўсім фронце і былі вельмі заядлые на дольным яе цячэньні між Вісліцай і Дольным Корчыном. У ночы на 11 сьнежня і увесь дзень ізноў ішлі бітвы асабліва крывавые між Сохачовам і Болімовам, і ўзноў атакі немцоў былі адбіты з вялікімі для іх стратамі. 12 сьнежня бітвы ішлі крыху меней заўзятые, апрача району, прылегаючаго к Піліцы, гдзе ўсю ноч і ўвесь дзень крывавые змаганьня не спыняліся. У тым-жэ часе такіе-ж самые заўзятые бітвы адбываліся з аўстрыякамі ў нізінах рэкі Ніды, дзе праціўнік хацеў умацавацца на левым яе берегу, але к вечэру гэтаго-ж дня быў выбіты расейцамі з вёскі Вісліцы, заўзята ім абаранянай, а затым атціснуты за гэту рэку. 13 і 14 сьнежня паміж дольнай Віслай і Пілііцай, па лініі рэкі Бзуры і Равкі, вялікіх бітвоў не было. Аддзельные атакі немцоў расейцы усюды адбілі, асабліва немалые страты панесьлі немцы у часе некарыснай для іх атакі к поўдня-ўсходу ад Скерневіц. Паміж Пілііцай і верхней Віслай аўстрыякі перайшлі к абароне. **У Галіччыне** бітвы з аўстрыяцкім войскам адбываліся для расейцоў карысна. Як заўсёды, расейскае войска на гэтым полі змаганьнёў захоплівало кожны дзень шмат палонных. 12 сьнежня аўстрыякі былі збіты з лініі Тухов—Ольпінцы, а 13—расейскае войска заняло высоты каля Седліска, на левым беразе рэкі Бялы. За гэтые-ж два дні, 12 і 13 сьнежня, аўстрыякоў збілі расейцы з лініі Змігрод—Дукля, і праціўнік пачаў атступаць. Паміж іншым, пры пашырэньні расейскаго наступаньня ў старану Карпат, асабліва зьвертае увагу перэправа двух расейскіх пехотных паўкоў цераз рэку Ясёлку. Салдаты перэбраліся у брод па пояс цераз гэту рэку па сьцюдзёнай вадзе, пад жудасным агнём праціўніка, выціснулі аўстрыякоў з занятай імі пазыціі і захапілі у палон 4 афіцэроў і 150 салдатоў. На іншых напрамках гэтаго Ўсходняго фронту палажэньне без перамен.

**На Каўказкім фронце,** у районе Дутаха туркі мецілíся наступаць у розных напрамках, але былі расейцамі адбіты і атступілі. На Ольцінскім напрамку расейскае войска, перайшоўшы рэку Лаурсін, стрымало настунаньне значных турэцкіх сіл. У районе Саракамыша ваенные змаганьні развіваюцца. На Ванскім напрамку туркі пасьля заўзятаго супраціўленьня, панёсшы не малые страты, атступілі на лінію Сарай — Ассурлі. 13 лістапада ў районе Дутах наступленьне расейцоў закончылося заняцьцем лініі Хамур — Агадавэ, аткуль туркі атступілі панёсшы значные страты палоннымі.

**На Заходнім фронце,** дзякуючы зьменьшэнью тутака нямецкіх сіл на карысьць усходняго фронту проці расейцоў, хаўрусьнікам удаецца у некаторых мейсцах пасовывацца па трошку на перад. Сваім чынам, немцы усёж такі не сьпяць зусім у шапку, і то там, то сям напіраюць на хаўрусьнікаў заўзятымі атакамі.

**У Сэрбіі.** Хоць сэрбы і перэмаглі аўстрыякоў пакуль што у гэтай вайне, але, як пішуць газэты, палажэньне іхней старонкі дужэ не завіднае. На сэрбскім тэатры ваенных змаганьнёў стаіць вельмі благая пагода, ідуць вялікіе дажджы. З гэтай прычыны далейшае наступаньне сэрбскаго войска у гэты час немагчыма. Можна думаць і тое, што аўстрыяцкае войска распачне наступаньне са староны Герцоговіны, гдзе стаіць стасункова ня дрэнная пагода. Найгорэй для сэрбаў тое, што ў іх шмат чаго патрэбнаго не хапае. Гэтак, прыехаўшый ад сэрбскаго ураду у Маскву адзін сэрбскі дзеяч расказывае, што гарады: Ніш, Скопле, Крагуевец і інш. перапоўнены раненымі сэрбамі. Сэрбскі Чырвоны Крыж і Санітэт далі ўсё, што мелі. — «У нас — сказаў сэрбскі пасланец—страшэннае патрэба у матэр'ялах для перэвязак. Раненые чэкаюць па 10 –15 дзён. Большая часьць уміраe (каля 50 прац.) праз тое, што не хапае чым лячыць.

Колькі часу таму узрывам знístожэны тоннэль (пад'земная дарога) Заічара, які наладжэны быў наладжэны быў на дарозе, злучываючэй Сэрбію цераз Дунай з Расеяй. Уперад яшчэ быў ўзарваны мост на р. Вардары. Дзякуючы гэтым узрывам Сэрбія асталася зусім адрэзанай ад Франціі і Расеі.

**Чуткі аб замірэньні** хоць на Каляды засталіся толькі чуткамі. Тэрміновые (срочные) тэлеграмы с тэатру ваенных змаганьнёў паведамляюць, што роўна ў поўнач, калі надыйшло вялікае сьвята Нараджэньня Хрыста (павэдлуг новаго стыля), на ўсіх тэатрах ваенных змаганьнёў адбываліся найкрывавейшые бітвы, цягнуўшыеся усю ноч. Адно толькі мейсцэ, гдзе панавала цішыня—гэта пад Перэмышлем,—тут у гэту ноч замоўкла стрэляніна. Паміж іншым, бэрлінскіе лятуны пастанавілі павіншаваць сваіх салдатоў усходней арміі і праляцець над пазыціямі ў дзень Новаго Году. Маняцца прасіць глаўную кватэру расейскай арміі ў часе спатканьня Новаго Году не стрэляць у самалёты.

## На вайне і каля вайны.

**Крэпасьць пад зямлёю.** У цяперашнюю вайну увялі новы лад у фортыфікацію (украпленьне): крэпасьць пад зямлёю. Як апісываюць нямецкіе і голяндзкіе ваенные карэспандэнты, крэпасьць пад зямлёю ладзіцца у тры рады акопаў, займаючых абшар у дзесяткі квадратных вёрст, с памостамі, цэмэнтовымі пляцоўкамі для цяжкіх гарматоў, са злучынамі паміж аддзельнымі батальёнамі па тунэлях і с шырокімі, капанымі у зямлі, калідорамі, па якіх праходзіць войска. Усюды уладжэна сыгналізація, тэлефон, вартаўніцкіе посты, ангары (памешчэньня) для самалётаў, мейсцы для пакоўкі знарадоў, электрычная станція. Пад Антвэрпэнам і Вэрдэнам у тых мейсцох, дзе немцы думаюць аставацца на болей доўгі час, яны уладзілі цэлы гарадок, с пастройкамі бітаго каменьня, цэглін, цэмэнту, с комінамі для дыму—пры

гэтым дым нішчыцца асобымі апаратамі с электрычным асьветленьнем. Для стрэлкоў, для арудзій, як полевых—так сама і асадных, уладжэны асаблівые акопы. Крэпасьць пад зямлёю маець канавы, акружэна увакол воўчымі ямінамі, калючым дротам і электрычнымі моцнымі токамі.

Карэспандэнт «Rot. Cour.», быўшы у гэтай крэпасьці, кажэ, што кожны камок зямлі у Франції і Бэльгіі абліт крывёю. Каб узяць гэткую сыстэму акопаў або аддаць, трэба палажыць дзесяткі тысяч людзей. Ня дзіва, што страты людзей так вялікіе, што ад армій, выступіўшых у паход, к канцу вайны павінны астацца замест мільёнаў—тысячы і сотні.

—Сьвет здрыгнецца ад жудасьці перэд стратамі у цяперашней вайне — кажэ той самы карэпандэнт.

**Кровапраліцьце бітваў.** Цяперашніе бітвы і бoi называюць кровапраліўнымі. І гэта праўдзіва: кулямётны агонь руйнуець рады за радамі Аднакжэ, с прычыны расцягнутасьці агульнай лініі фронту на сотні вёрст, выходзіць, што на квадратным пляцу людзей куды меней чым у ранейшых войнах. Сьціскласьць войск зьменшэна, яны парадзелі. Дзеля таго лічба страт на вядомым квадратным пляцу зьменшэна. Напрыклад, у Бородзінскую бітву лягло з абедзьвух старон сто тысяч у адзін дзень на невялікам пляцу Бородзіна. Гэта была гара крывавых цел, якіе не давалі пралетаць кулям. Гэткіх бітваў цяперашняя вайна ня мела.

**У турэцкай Армэніі.** «Кавк Слово» кажэ, што апрача арміі, стаячэй у Эрзеруме, ад Вана да Башкалэ стаіць каля 60,000 турэцкаго войска. У змежных з Расеяй вілайэтах (губэрнях) мобілізованы курды. Яны размешчэны у Алашкерце, Хасан—Калэ і на турэцка-персідзкай граніцы. Апрача таго афіцэры немцы, лікам каля 25 чэлавек, у розных часьцях дзержавы займаліся формірованьнем чэтнічных атрадоў, прызначэных для партызанцкіх набегаў на расейскую граніцу і інш. Усе гэтые афіцэры немцы—організатары чэтнічных атрадоў супроціў расеі—добра ведаюць расейскую мову. Чэтнічные атрады форміруюцца конные і пехотные по 20—25 чэлавек у кожным атрадзе. Немала падгаворшчыкоў эмісароў атпраўлена у Пэрсію. Сярод іх асабліва выдзеляюцца арганізатары нападу пэрсідзкіх фідаеў на расейскае войска у Таўрызе у сьнежні 1912 г. Амар Гэтмат (быўшы паліцмэйстэр Тэгэрану) і Ібрагім—бэк ды інш. Абодва яны цяпер знайходзюцца на турэцка-пэрсідзкай граніцы с сваімі бандамі і робюць набегі на расейскае войска. Павэдлуг апошніх вестак некольві атрадоў конных чэтнікоў, пад загадам нейкаго Арслан—бэка з Трапензунду, праз Рызэ крануліся у мястэчка Віцэ-Кон, якое знайходзіцца у 25—30 вёрстах ад Батума.

**Нешчаснае здарэньне.** Аднэй з англіцкіх батарэй была паслана прасьцярога, што у лініі яе абстрэлу павінен прайсьці без выстрэлу полк англіцкай пяхоты, ідучый у атаку на ворага. Ордынарэц (пасланец), што пайшоў з гэтым загадам, быў забіты на дарозе і, гэткім парадкам, прасьцярогі батарэя не атрымала. Па раней адданым загаду батарэя не перэставала стрэляць, і йшоўшый у атаку англіцкі полк ад сваіх-жэ куль меў вялікіе страты.

**Асадное палажэньне у Англіі.** 1-го сьнежня у Англіі запанаваў асобы закон, які папраўдзе заводзіць у Англіі асадное палажэньне. Адміральцейство і ваенные ўласьці маюць права без уселякаго агранічэньня прыймаць розные меры для абароны краю. Право прыватнай ўласнасьці касуецца. Ўласьці маюць права рэквізаваць уселякую будоўлю і нават зруйнаваць яе, калі таго вымагаюць інтэрэсы абароны. Яны могуць закрываць фабрыкі і таргоўлі, выселяць жыхароў з населённых пунктоў і сэквэстроваць (забіраць у казну) розную пасуду і харчы. Урад маець неагранічанае поўнамоцтва рабіць сьледзтва і арышты і кантраляваць ўласьнікоў аружжа і ўзрыўных рэчэй. За праступкі ў друку і на словах ідзе цяжкая кара.

**«Аттуль».** В. Ропшын у сваіх лістах с Парыжа у газ. «День» малюець жудасны абразок с палеў бітвы у Франціі, са слоў аднаго францускаго лейтэнанта:

— Наш камандзір у часе бітвы раптам звар'яцеў. І гэта ня першыня. Мы, афіцэры, зразумелі, што ён вар'ят. Ён непрытомна гаварыў, плакаў, крычаў... Але людзі аб гэтым ня ведалі і, вядома, слухалі ято. Слухалі і мы... Што-ж рабіць? І вось адзін раз стаялі мы у лесе. Перад лесам аткрытае поле. Хутка чуем, камандзір гаворыць: «дзеці, вось немцы!.. Трэба выставіць наперад дзьве гарматы... Хто не баіцца,—за мной!..» У полі рыецца шрапнэль. Салдаты сумневаліся. Але што рабіць? Ідуць... Я патклікнуў сэржанта і кажу: «Прыкажыце людзям вярнуцца...» Сэржант пайшоў і перэдаў прыказ. Камандзір кажэ: «Трусы нешчасные! ўпярод!» Аднакжэ людзі вярнуліся. Толькі двое не захацелі пайсьці... Вы бачылі, у нашых гармат ёсьць шчыт, за шчытам два сядзэньня. Яны селі на гэтые сядзэньня і чэкаюць... Праз дзьве гадзіны агонь змоўк. Я вышоў з лесу, паглядзеў.. Бачу—яны седзяць. Ну, думаю, дзякуй Богу... Падходжу і што-ж? Так, —яны седзяць за шчытам, але абое без галавы... Ёсьць плечы, тулова, рукі і ногі, а галавы німа... Акрываўленае мясо.

— А камандзір?

— На другі дзень яго забіла шрапнэль..

**Немцы умацаваліся.** Варшаўскі карэспандэнт газэты «Juorнal» пішыць, што немцы усходнюю Прусію так умацавалі, дзякуючы балотам, лесам і вазёрам, што яшчэ сьвет не бачыў такой крэпасьці. Кожны праход паміж вазёраў, кожна дарога калі не затоплена і не падложэны міны, то абгароджэна калючым і таўстым дротам, па каторым могуць пусьціць у кожную хвіліну электрычэства аграмаднай сілы, якое, калі дакнуцца, забівае чэлавека.

# З народных песень.

**У нядзельку раненька** *).

У нядзельку раненька
Узышло сонцэ ясьненька,
Татка коніка корміць,
Дужа жаласна плачэць.
Прышоў сынок пытаець:
«Чаго, тата, так плачэш?
«Ды на што-ж, каму рана
«Татка коніка корміш?»
—«Табе сыночку, табе:
«На вайну ты паедзеш—
«На вайну ты паедзеш,
«Ах! аттуль не прыедзеш.
«Панясеш ты галоўку
«Ды ў чужую старонку;
«Занясеш свае плечы
Пад турэцкіе мечы...»
—«Не плач, татачка, пры мне:
«Наплачэшся без мяне;
«Наплачэшся даволі,
«Як ня ўвідзіш ніколі».

* * *

У нядзельку раненька
Узышло сонцэ ясьненька,—
Матка есьцікі варыць,
Дужа жаласна плачэць
Прышоў сынок пытаець:
«Чаго, мамка, так плачэш?
«Ды на што-ж, каму рана,
«Мамка, есьцікі варыш?»
—«Табе, сыначку, табе:
«На вайну ты паедзеш;
«На вайну ты паедзеш,
«Ах! аттуль не прыедзеш.
«Панясеш ты галоўку
«Ды ў чужую старонку,
«Занясеш свае плечы
«Пад турэцкіе мечы...»
—«Не плач, мамачка, пры мне:
«Наплачэшся без мяне;
«Наплачэшся даволі,
«Як ня ўвідзіш ніколі».

* * *

У нядзельку раненька
Узышло сонцэ ясьненка,—
Сестра хустачка рубіць,
Дужа жаласна плачэць.
Прышоў браток пытаець:
«Чаго сястрычка плачэш?
«Ды на што-ж, каму рана,
«Сестра, хустачкі рубіш?»
—«Табе, брацітка, табе:
«На вайну ты паедзеш;
«На вайну ты паедзеш,
«Ах! аттуль не прыедзеш.
«Панясеш ты галоўку
Ды ў чужую старонку,—
Занясеш свае плечы
Пад турэцкіе мечы».
—«Не плач, сястрыца, пры. мне:
«Наплачэшся без мяне, —
«Наплачэшся даволі,
«Як ня ўвідзіш ніколі».

*) «Bielaruskije pieśni z notami». Томік І-шы. Сабраў і выдаў А. Грыневіч. Петраград 1910 г.

# ВЕЦЕР.

Гэй, вецер заходні з далёкай краіны!
Аб чым ты размову так сумна павёў?
Мо горэ нагналі ліхіе ўспаміны
Ці злые здарэньня апошніх дзянькоў?
Ой, сумна с табою: слязьмі і стагнаньнем
Гаворка твая аддаецца ў палёх.
Над кім ты сумуеш глухім прычытаньнем,
Надгробнаю песьнею плачэш ў платох?
І тугай бязмерной ты дзень затуманіў,
Вясёлае небо ў жалобу абвіў.
Гэй, вецер заходні! каго ты аганіў?
Над кім ты заплакаў, так злосна узвыў?
Па кім ты спраўляеш жалобу-хаўтуры,
Ігрышчэ сіл цёмных, начніц, ведзьмакоў?
Ці ты раздзімаеш вялікую буру,
Усюсьветную буру, сірот плач і ўдоў?
Гэй, вецер разгульны! ты—вечны, дарожны,
Асуджэны Богам, людзьмі закляты.
Заўсёды маркотны, заўсёды трывожны,
Спакою ніколі ня ведаеш ты.

**Якуб Колас.**

7/IX—14 г.

# Разьбітая надзея.

Сонцэ хінулося к зямлі на атпачынак, калі Сьцепан згарнуў апошні пракос сена у капу.

Хоць і добра чулася боль у руках і дрыжэлі ат працы ногі, Сьцепан наважыў скончыць будаваць стог і тады рушыць да дому. Нейкую прыемнасьць атчуваў ён у сваім сэрцы, як мысьліў, што прыйшоўшы да дому, бацька пахваліць шчыраго працоўніка і апроч пахвальбы дасьць залатоўку, а то і дзьве—на кірмаш к сьвяту. А мейсцэ для залатовак Сьцепан даўно меў на прыкмеці. Толькі бы грошы, то ужо той гадзіннік, каторы ён памыкаўся выкруціць на круцёлцэ, цяпер будзе яго. Апошні раз быўшы на кірмашы, Сьцепан, каб выйграць той гадзіннік, пракруціў і свае і бацькавы грошы і, ў знак неўдалай ігры, нёс да дому дудачку для дзяцей і карты. Гадзіннік так і застаўся не здабытым.

— Ну нічагутка,—супакоіваў ён сам сябе,—пракручу рубель—два, а цыбулька будзе мая. Пры гэтым ён дастаў с кішані карты і пачаў перакідаць з рукі у руку. Успомніўся яму той кірмашны дзень, гаспадар круцёлкі, яго на століку рэчы і салапякі, што былі ля стала. У вушах Сьцепана ешчэ гучэла ліра, енчылі старцы і хрыпаты голас круцеля, што разгледаўся па пляцу:

— Першы нумэр... лямпачка! другі нумэр... порт-табак! трэці нумэр... неналазьце, ліха матары! столік паломіця, — крычыць ён, махаючы кулаччам ля носу хлапцоў. Трэцьці нумэр быў чы поўны, чы пусты, але як праскочыў праз зубы, так і зьнік.

Тасуючы карты, Сьцепан мысліў што ў трэцьцім нумэры і быў гадзіннік, толькі круцель не іначы атуманіў усіх. На другі раз Сьцепан наважыў на гэтым нумэры спыніць хціўца і выявіць хітрасьць.

Ужо саўсім села сонцэ, як выбраўся Сьцепан адыйходзіць с сенажаці. Капа, як гара, красавалася на зялёнай абстрыжэнай мураўцэ. Чырвонаватае неба асьвечало вярхушку прывяўшай травы.

Сьцепан стаяў і любаваўся сваей працай, але трэба было ісьці дамоў на атпачынак. Толькі скрануўся з мейсца, аж убачыў свайго сябра Ігнальку, едучаго праз луг с пустымі мажамі.

— Ну, што, касец, да дому едзім!—звонка засакатаў Ігналь.

— Да дому,—атказаў Сьцепан.

— Ну, дык курнём разок, а тады ужо...—сказаў злазючы Ігналь.

Хлапцы закурылі, прыселі, разгутарыліся. Куручы, Ігналь выказаў, што мае ахвоту гульнуць у карты і што ёсьць нават грошы, але картоў німашака. Сьцепан зараз дастаў с кішані карты, што выйграў на кірмашы. Праз хвілю блішчэлі на мураўцэ залатовачкі.

Гульня распачалася. Зьмяніліся у абодвых твары; сталі сур'ёзнымі, задуменнымі.

Ігналь, пасьля ёмкай адбіткі, згроб свае і Сьцепановы грошы і спытаўся:

— Ну, а далі?..

— Нема грошы.—атказаў Сьцепан.

— Нема — так нема, згуляем як будуць.

— А я цяпер хачу,—наважыў Сьцепан,—я павінен адыйграцца.

— Адыйграцца, то адыйграцца, але чым?

— Павер, я заўтра аддам табе, Ігналька...

— Э... хто ведае, што будзе заўтра! Захацеўшы, можэш мець і сягоньня.

Сьцепан гатоў быў праваліцца скрозь зямлі, чымся жыць у гэту хвілю. Яго рупные пальцы соваліся па кішэнях, шукалі шчасьця, але нічога не знайшлі. Ігнат стаяў, уставіўшы вочы на капу.

— Добрая травічка,—бубнеў ён,—а яшчэ кажэш, грошы нема...

Сьцепан глянуў і замысьліўся. У вочах яго блiснуў нейкі аганёк і зараз згас.

— А што табе зробіцца, калі ты крыху сена сплавіш, — стары не спазнае, тым часам у руцэ будуць грошы і можэш адыйграцца.

Сьцепан паверыў. Ён ніколі не даваў веры, што Ігналь і цяпер ашустае яго.

Гульня на гэты раз пайшла спрытней. Ігналь, як галодны воўк, браў бітку за біткай, і ўрэшце застаўся гаспадаром над працай свайго сябры Сьцепана. Нічога не кажучы, ён спрытна перакінуў сена на мажы і нокнуў на

# Крыху цікавых слоў.

Кожны культурны народ стараецца пазнаваць сваю мову ды разьбіраць значэньне паасобных слоў і іх гісторыю, каб знаць родную мову і родную гісторыю. Дужые народы маюць дзеля выўчэньня сваей мовы асобные вышэйшые школы, вучуць яны роднай мовы і сваю моладзь па сярэдніх і ніжэйшых школах, бо мова родная адбівае ў сабе ня толькі цяперэшнюю душу народу, але і расказывае яго гістарычные перэжываньня. Кожны народ павінен пазнаваць сваю жывую мову, ад'жыўшые паасобные словы з яе, каб разумець дух мовы, а гэто і мы, беларусы, павінны рабіць дзеля таго-ж самаго.

Гісторыя мовы, гэта—абшырная навука і ўсю яе абхапіць у кароткіх нарысах цяжка, дзеля гэтаго прашу не марокаваць на мяне, што агранічуся толькі тлумачэньнем горсткі паасобных слоў.

Ёсьць у нашай мове слова *«сачыць»*, каторае азначае—сьлядзіць, дашуківацца. Калісь, за князёўскіх часоў былі паміж іншымі службавые людзі, каторые даглядалі лясоў і зьверыны і на іх павіннасьці лежало устраіваць аблавы. Людзі гэтые называліся «асочнікі». Выбіралі іх с паміж селян князеўскіе рэвізары. Асочнік не адбываў ніякіх іншых павіннасьцей, апрача дагляданьня лясоў і зьвярыны, і за гэта карыстаўся раней двумя, а пазьней аднэй валокай зямлі. Слова «сачыць» дужа старое,—сустрэчаецца і ў стара-славянскай мове, паміж іншымі памятнікамі і у «Рускай Праўдзе» і гэтак сама азначае разследаваньне, розыск. Жывая беларуская мова ва ўсіх закутках Беларусі знае гэтае слова у старым яго значэньні, а ў іншых мейсцох і ў разшырэнным. Гэтак, у Вітэбшчыне і заходняй часьці Віленшчыны пад словам «сачыць» разумеюць ня толькі—сьлядзіць, патпілновываць (сачыць курыцу, дзе яна нясецца), але кажуць такжэ: «сын бацьку пасачыў», у значэньні, што сын падобен да бацькі, унасьледаваў па бацьку падобнасьць с твару, ці характэру. Есьць такжэ слова *«асачыць»*, значэ акружыць што кругам каб узяць,—акружыць розыскамі.

**Друк.** Слова гэта пачаткова азначало—палку, кіёк. І цяпер у нас называюць «друкамі» сукастые калы, на каторых сушуць льняные галоўкі перэд малацьбой (дзісенскі пав.); а у іншых мейсцох (магіл. губ. на поўдзень) кажуць «вазьмі дручок і прыжані гусей», гэта значэ: «вазьмі палку (кіёк) і прагані гусей».

**Пляніца.** У жывой беларускай мове—пляніца называюць расток; ад гэтаго слова пайшло «пляніцца»—значэ раскарэняцца, «племя» значэ грамада аднаго карэня, расплод—«пакінуць на племя»,—значэ на расплод, «племунік», «плён» і інш.

**Шчыр.** Кажуць на Беларусі «шчыр-бор», «зачапіў лемешам шчырэц», «шчырка». Заўсёды у значэньні цэліны. «Шчыр-бор»—значэ бор, у каторым не ступіла людзкая нага; «шчырэц»—значэ слой зямлі, катораго не крануў да таго лемеш, «шчыр-дзяўчына» кажуць у значэньні расейскаго слова «дѣвственница». Апрача гэтаго пачатковаго значэньня, ад гэтаго карэня расплеНілося многа іншых слоў; «шчыры», што па расейску значэ *«искренній»*,—«шчырасьць», «зашчырэць» (значэ засмягнуць, засохнуць, сціснуцца, стацца падобным да суцэльнаго)—і інш.

**Сябр.** Слова знанае як у старой беларускай літэратуры, так і ў жывой мове. Пачатково «сябарство» азначало тое самае, што і «пабратымство» у другіх славянскіх народоў. Сябрамі ставаліся людзі сабе чужые, але каторые надрэзаўшы мезіные пальцы, змешалі сваю кроў і праз гэта сталіся якбы братамі аднэй крыві. У пазьнейшые часы слово гэта утраціло сваё пачатковае значэньне, ці было заступлена іншым, толькі ўжо у XVI сталецьці, прыбрало такое значэньне, якое яно і цяпер у жывой нашай мове мае:—таварыш, хаўрусьнік, супольнік. У статуце Літоўскім (1588 г.) сябрамі называюць людзей, каторые маюць якую сумесную маетнасьць; было нават асобнае «сябрэннае» право, у каторым гаварылося, на якіх варунках людзі могуць дзержаць супольную маетнасьць і як іх разсудзіць. На Падзьвіньню кажуць беларусы «сябра» да кожнага беларуса у значэньні «земляк», «таварыш». «Сябраваць» кажуць у значэньні—дружыць, быць с кім у дружбе, мець с кім супольные справы і т. п. Калі купляюць двое—трое людзей у складку пшчол, кажуць—«на сябры купілі пшчол».

**В. Л.**

# З Беларусі і Літвы.

## З Віленшчыны.

**Аб прызыве.** С прычыны маючаго быць прызыву за 1915 год с 1-го лютаго, будучаго году, паміж іншым, віленскім губэрнаторам апавешчаецца: 1) заявы па незапісях і памылках у прыватных прызыўных спісках падаюцца установам, састаўляючым успомненые спіскі, да 22 сьнежня 1914 г., а пасьля гэтаго тэрміну—прыналежнаму воінскаму прысутству; 2) асобы, атрымаўшые ў сёлетнім прызыве атсрочку па 47 стацьці, прыклікаюцца к адбываньню гэтай павіннасьці ў дасрочны (раней тэрміну) прызыў; 3) атсрочкі для закончэньня навук будуць з малымі пераменамі давацца на агульных асновах; 4) заявы аб атсрочках прыймаюцца да 1 студня, а ў разе важных прычын прасрочкі—да 1 лютаго 1915 г.; 5) заявы аб жаданьні адбыць ваенную павіннасьць вольнаапрэдзеляючымся або ахвотнікамі прыймаюцца да 1 студня 1915 г.; 6) заявы аб пераводзе у іншы прызыўны участак прыймаюцца да часу атрыманьня на мейсцох указа аб дасрочным прызыве; 7) атсрочкі па сямейным палажэньню, дадзены ў часе прызыву 1914 г., прадаўжаюцца да 1916 г.

**Абавязываючая пастанова.** Главуны начальнік дзвінскаго ваеннаго округу выдаў абавязываючые пастановы: 1) аб агранічэньні тарговулі лякам і політурай; 2) аб забароне вывазіць за межы округа скураны тавар на боты без асабліваго пазваленьня; 3) аб забароне даваць памешчэньне салдатам, не прыналежным для расквартэроўкі, і аб заяве аб прабываньні іх ўласьцям; 4) аб упарадкаваньні аўтомобільнаго руху.

**Дровы для сем'яў запасных.** Віленскае упраўленьне земляДзельля і гасударственай ўласнасьці загадало лясьнічым выдаваць с казённых лясоў сем'ям новабранцоў павал дарма, а сухастой за самую невялікую плату.

**Нямецкіе гаспадарскіе прылады.** Надовічы у Вільню дастаўлены на 100 з лішнім фурманках плугі, бароны, паровые машыны і інш. гаспадарскіе рэчы, забраные на нямецкай зямлі, занятай расейскім войскам.

**У ваенным судзе.** Віленскі ваенны суд, разгледзіўшы справу аб селянах І. і А. Эйдукайцісах, вінавачэных за пабіцьцё у лесе у сувальскай губ. лясьніка Добу. Эйдукайцісоў ваенны суд прызнаў віноўнымі ў прычыненьні лясьніку лёгкіх пабоеў і прыгаварыў на два гады у турму.

Віленская судовая палата разгледзіла перайшоўшую ёй з акружного суду справу мешч. А. Казлоўскаго, 54 год, які ў 1881 г. скрыўся ад ваеннай павіннасьці. Праступак Казлоўскаго выкрыўся толькі у 1913 г. Палата, разабраўшы гэту справу і застасаваўшы маніфэст, ад кары А. Казлоўскаго асвабадзіла.

**Жарты.** Надовічы у адну віленскую бальніцу прывезьлі з двара Кошаны 18-летняго Алехновіча з адрэзанымі рукамі. Алехновіч, дурэючы з іншымі, усадзіў левую руку у сечкарню і хочучы яе ратаваць, ўсунуў і, правую. Алехновіч у двары Кошанах служыў парабкам.

## З Міншчыны.

**Новая чыгунка** Разань—Варшава, церэз Бабруйск, Старые Дарогі, Урэччэ і Слуцк, як пішыць «Бобруйскій Курьеръ», будзе пабудавана напэўна. Такім чынам, гэта новая чыгунка злучыць горад Бабруйск с шмат якімі мейсцамі павету, а такжэ з горадам Слуцкам, каторы да гэтаго часу зусім не мае чыгункі. Гэта—дужэ важная рэч. С пабудаваньнем новай дарогі напэўна падыймецца дабрабыт шмат якіх у нашым краю вёсак і мястэчак, а такжэ гарадоў Слуцка і Бабруйска.

**300,000 руб. на змаганьне с пошуснымі хваробамі** маніцца выдаць у сябе горад Мінск.

---

каняку. Скрыпнулі немазаные калёсы—якбы заплакакі па шчырым прыцоўніку, і ад'ехалі.

Сьцепан стаяў і маўчаў. Ён ня мог сказаць і поўслоўца, бо прызнаваў проігрыш па закону, толькі думка,—што будзе далей пачынала закрадацца ў яго сэрцэ.

Высока набітые сенам мажы звольна каціліся па сенажаці у другі бок ад вёскі Сьцепана, а сам Сьцепан, панурыўшы галаву, ішоў да дому з разьбітай надзеей мець ад бацькі падзяку за шчырую працу ды выкруціць на кірмашы той гадзіннік.

**Галубок.**

# Чараунік*).

*(Ахвяруецца Власту).*

— Прыкончым яго! прыкончым!—крыкнулі ўсе і рынуліся да нябошчыка. Але тут нябошчык падняўся с свайго мейсца і спрытна загасіў рукою ўсе сьвечкі...

— Ратуйце! ратуйце!—заравелі ўсе дзіка ад вялікаго страху і, як непрытомные, штурхаючы адзін аднаго, чуць жывые выбраліся с хат і, моцна запёршы за сабою дзьверы...

— Людзі добрые,—пачаў маліць-прасіць нябошчык,—я—жывы, ня бойцеся, я вам нічога кепскаго не зраблю!

— Чараўнік! чараўнік!—крычэлі ўсе на вуліцы, ня слухаючы яго. На крык зляцелася ўся вёска і давай раіцца, што тут рабіць. Хто казаў ехаць за папом, каб ён выгнаў сілу нячыстую, хто раіў асінавай доўбняй забіць яго, а хто хацеў хату патпаліць з ім разам, каб і костачак яго не асталося.

— А браточкі мае родненькіе!—пачаў за дзьвярыма енчыць чараўнік,—не пужайцеся мяне! я гэтакі, як і вы чэлавек. Бойцеся губіць душу хрысьціянскую!..

— Ня слухайце, ня слухайце яго!—крычэлі с таўпы,—гэта нячысьцік шуры-муры свае разводзіць!..

Чараўнік пачаў барабаніць у дзьверы ды драпаць рукамі, як кот ўсё роўна...

— Пу-у-усьці-і-іця! Што вы гэта задумалі, Бог на небе маўчаць ня будзе! Гэта ж Бог ёсьць на сьвеце!..

— А так, а так—ёсьць Бог сьвяты на сьвеце!—атказаў яму адзін сівы дзед,—і Ён нам паможыць выветрыць сілу нячыстую с хат нашых!..

Яшчэ з большым стараньнем драпаўся за дзьвярыма чараўнік, як ашалелы драпаўся, ажна жудасна усім зрабілася...

— Родненькіе мае! даражэнькіе мае! гэта-ж я гэткі чэлавек, якіе і вы, што вы у вамне угледзілі? Хто на вас дур напусьціў? пашкадуйце сямейку маю..

Брэшыш, дух паганы! Брэшыш!—Хтосьці злосна крыкнуў,—мы цябе ня выпусьцім!

— Я не памёр,—пачаў зноў чараўнік і голас яго хрыпеў ўжо, як тупая піла, і ўсё слабеў, ды слабеў.—Я ўсё чуў, што вы рабілі, толькі крануць ня мог ні рукой, ні нагой, ні брывёй міргнуць, ні слаўца выгаварыць... Пашкадуйце, душу чэлавеччу не губіце!..

— Хіцёр, ой, хіцёр, ты, вырадак пякельны!—грымелі людзі...

Ужо шэпярлівым голасам прыдушэнаго, чуць жывы, яшчэ болей жаласна заенчыў чараўнік:

— Ці у вас жальбы ніякай німашака? Што вы гэта сабе задумалі?.. кроў людзкая ляжэць на вас...

— Ну досіць, досіць ўжо, нячысьцік, музыку сваю разводзіць,—атказаў яму адзін стары,—на гэты раз не ашукаеш, у пеклі мейсца твае!...

За дзьвярыма чараўнік яшчэ рухаўся і слаба стагнаў бяз слоў... Бабы плакалі. Селяне жэгналіся і ня ведалі што рабіць...

— Патпаліць хату трэба і квіта! Згадзіліся на гэта ўсе. Зося бедная рукі заламала і пачала енчыць, што яна без кутка астанецца, што яе загубюць, але ніхто ня слухаў жальбы беднай кабеціны. Тымчасам усе пачулі, як шыбіны бразнулі у вакне і нехта выскачыў с хаты.

— Уцёк! уцёк!—загудзелі ўсе у вадзін голас. І людзі убачылі, як у адных панчохах і без кажуха паляцеў чараўнік, нібы падхоплены нячыстай сілай. Ніхто і ня думаў гнацца за ім; гэткаго адважніка не знайшлося паміж імі. Месяц асьвяціў белы абшар палёў і сьнег заблішчэў дарагімі каменьнямі... Здалёку ясна было відаць, як чараўнік даляцеў да лесу і хутка счэз у густым боры у белым царстве шэрані і цішы... І павялічыўся яшчэ болей страх у людзей... Во хто па начох будзе іх цяпер пужаць і мучыць!.. Сіла нячыстая вырвалася з іх рук...

Тапталіся, тапталіся яны на мейсцы сваім, як перапужаные авечкі, туліліся бліжэй адзін да аднаго і таёмная жуцасьць абхапіла ўсіх... Моўчкі, з асьцярожнасьцяй пагледаючы па бакох, яны пацягнуліся дамоў. Мяцеліца круціла ўсю ноч. Вецер выў у комінах на розные галасы, наганяючы неспакойные сны на перэпужаных селян.

На заўтрае людзі знайшлі чараўніка за борам на магілках; прытуліўшагося да ёлкі, адубеўшаго і цьвёрдаго, як кавалак лёду; над яго трупам вецяр выў з вялікай жальбай...

**Змітрок Бядуля.**

Канец.

---

*) Гл. «Н. Н.» № 49.

**Коопэратывы** (грамадзкіе суполкі). У скорым часе маняцца аткрыць у Мінску хаўрусную хлебопекарню з аддзеламі на акраінах гораду для продажы хлеба і іншых харчоўных прадуктоў па недарагіх цэнах.—Навагрудзкае земскае сабраньне пастанавіло хлапатаць аб безпярэчным пазваленьні хаўруса коопэратывоў.—У м.Столбцах, мінск. пав., наладжываецца хаўрусная крама, у якой будуць прадавацца усе найпатрабнейшые рэчы за недарагую плату.

**Цьвярозасьць.** Мінская паліція надовічы запечатавала у Мінску усе запасы «моцных напіткоў» у мейсцовых рэстаранах і гарэлачных крамах.—У Мінскай губ. акцыза закрыла 75 шынкоўняў, стасоўна да прыгавароў на гэта селянскіх сходоў.

**Пажары.** У Мінску згарэла фабрыка кафлёў, належачая да Фрумкіноў. Шкоды—каля 30,000 руб.—У барысоўскім пав., у фальв. Каменная Студня згарэла сыраварня І. Матушэвіча.

——

У **Вітэбскай губ** расходы на лекарскіе справы ідзе каля 40 кап. у год с кожнаго жыхара. Адзін доктар у мястэчках выпадае у сярэднім на 4000 людзей, а ў вёсках на 14,000.

У **Гродзенскай губ.** камэндант Гродзенскай крэпасьці засадзіў на 3 месяцы гаспадара чайной А. Кромфэльда за прадажу аднэй бутэлькі каняку, а мешч. І. Янкова за прадажу моцных напіткоў—на 3 месяцы турмы, а пасьля атседкі—высылцэ з района крэпасьці.

У **Сувальскай губ.** Дэпутат Гас. Думы М. Ічас, які надовічы вярнуўся с паездкі па Сувальскай губ., расказвае, што ўся пагранічная часьць гэтай губэрні так зрыта, што спадзевацца якога-колечы ураджаю к налецьцю нема чаго. Жыхары жывуць у зямлянках. Шмат якіе проста «пухнуць» з голаду.

# З усіх старон.

**Плата ратнікам за іх адзежу.** Ваенные ўласьці пастанавілі купляць ад ратнікоў, прызываных ў зімовые месяцы да канца лютаго 1915 г. ўласную іх адзежу, прыгодную для нашэньня ў неслужбавы час, с платай: за вопратку, заменяючую сабой шынэль, не даражэй 5 р. 50 к., за верхнюю суконную рубашку—не даражэй 2 руб. 40 к., і за шапку—не даражэй 65 кап.

**Як даведывацца аб ваенна палонных.** Цэнтральнае справачнае бюро аб ваеннапалонных пры глаўным упраўленьні «Чырвонаго Крыжу» ў Петраградзе просіць тых, што наводзюць спраўкі, пісаць прозвішчэ, імя, чын, і названьне ваеннай часьці, у якой знайходзіўся ваеннапалонны, а такжэ напісаць і свой акуратны адрэс, каб «бюро» магло выслаць патрэбную спраўку. Запытаньня, напісныные паводлуг гэтых правілоў, можна перэсылаць у бюро без марак.

**Ад Верхоўнаго Глаўнакамандуючаго.** «На аснове 23 ст. ваенных законаў, ваеннаслужачым пазваляецца безпасрэдня (самім сабой) звертацца на Найвышэйшае Імя, да Асоб Царскай Фаміліі і к вышэйшым начальнічым асобам толькі ў справах асабістых, не адносячыхся да службоваго палажэньня і не іначэй, як з веданьня бліжэйшаго начальства. А на аснове 21 ст. ваенных законоў у ваенны час, ніякае урадовае мейсцэ, установа і асоба ў Дзержаві не мае права безпасрэдня зносіцца з Верхоўным Глаўнакамандуючым, апрача міністроў, глаўнаупраўляючых аддзеламі войска і асоб, безпасрэдня падўласных Верхоўнаму Глаўнакамандуючаму».

**Аб вольноапрэдзеляючыхся 2-го разраду.** Выйшоў загад аб тым, каб экзаміны на вольноапрэдзеляючыхся 2-го разраду адбыліся ў студні 1915 г. і с такім вылічэньнем, каб яны закончыліся к 20—25 студню, з мэтай даць магчымасьць здаўшым экзамін паступіць у ваенные школы да 1-го лютаго.

**Земля — салдату.** У Адэсі носюцца з думкай наладзіць складчыну (фонд) на пакупку зямлі для селян-ваякоў, асабліва выказаўшых сябе на вайне і абдараваных Георгіеўскім крыжам.

**Вышэйшая навука у Расеі.** Цяперака у Расеі ёсьць 108 вышэйшых вучэльнёў (80 для дзяцюкоў і 28 для дзеўчат), раскіданых у 22 гарадох. Агульная ў іх лічба вучняў у 1912—1913 школьным гаду была 112 774, (87,652 студэнтоў і 25,122 студэнткі), прафэсароў і вучыцелёў — 6,939. На ўсе гэтые школы было расходу 32 мільёны 500 тысяч руб., з якіх на долю казны, выпадае 19,900,026 руб.

Аб **вучыцелях неправаслаўнай веры.** Міністэрство асьветы растлумачыло, што асобы неправаслаўнай веры, складаючые экзамін на вучыцеля ці вучыцельку пачатковай школы, не канечна павінны здаваць экзамін с цэркоўна-славянскай мовы, аб гэтым толькі павінна быць зроблена стасоўная прыпіска у выдаванным сьвядоцтве.

**«Юбілейные» маркі** будуць прадавацца і ў 1915 гаду, аж пакуль усе не зрасходуюцца.

**Арышт прафэсара Грушэўскаго.** 13 сьнежня у Кіеві паліція арыштавала вядомаго украінскаго прафэсара Міхайлу Грушэўскаго. Як пішэ «Нов. Время», вайна прафэсара захапіла ў Львове, дзе ён у унівэрсытэці чытаў лекціі. У часе, калі у Галіччыну прыйшло расейскае войска, М. Грушэўскі выэхаў у Вену, а з Вены прыехаў у Кіеў, дзе мае колькі сваіх дамоў. Тутака яго выкрылі расейскіе жандармы і арыштавалі.

**Кара сьмерцяй.** У ніжнім-Ноўгарадзе маскоўскі ваенна-акружны суд за убіўство урадніка Одінцова засудзіў на кару сьмерцяй цераз павешаньне 5 людзей з вёскі Сосіна, балахінскаго пав.,—Козлова, Суслова, Озерова і двух братоў Горэвых.

**Забарона нямецкіх газэт.** Міністэрство дарог забараніло прадаваць на станціях чыгункі газэты у нямецкай мове.

**Немцы-колоністы** (пасяленцы) на паўдні Расеі старанна распрадаюць увесь свой жывы набытак. На мейсцовых рынках можна бачыць шмат выстаўленай на продаж жывёлы, што зьменшывае вельмі на яе цану. Шмат якіе колоністы заменіваюць свае сялібы на нерухумасьці у гарадох і агулам збываюць усю сваю гаспадарку.

**Эвангеліцкіе парафіі.** У Адэсі па загаду губэрнатора зачынена на ўвесь час ваеннаго палажэньня 6 парафій эвангеліцкіх сэктоў, с прычыны шкадліваго іх напрамку для дзержаўнаго парадку і грамадзянскаго спакою.

**Суд.** Сэнат пастанавіў аддаць пад судовае сьледзтва курляндзкаго губэрнатора Набокова за неправільнае карыстаньне с сваей ўласьці. Прычына была тая, што губэрнатар непраўна засадзіў пад арышт выдаўца газэты «Голасъ Либавы» Тэклю Любі. — Так сама пастанавіў сэнат аддаць пад суд тальсэнскаго (курляндзк. губ.) паветоваго маршалка шляхты, барона Радэна. Барон, калі да яго прыйшоў стражнік прасіцца дабравольцы на вайну, накінуўся на стражніка з лаянкай, сарваў з яго эполеты, адабраў шаблю, ды ў дадатку яшчэ засадзіў пад арышт.

**У Польшчы.** Пішуць, што ў польскіх губэрнях: калішскай, без мала ўсей петракоўскай, келецкай, значнай часьці радомскай, ў паўдзённых паветах люблінскай і холмскай, у без мала ўсей плоцкай, без аднаго павету ў варшаўскай па левай старане Віслы, у паўночных (за Нарвай) паветах ломжынскай губ., а такжэ у пагранічных паветах і часьці сэйнэнскаго сувальской губ. — тры чацьвёртые жытніх зьмен не абсеяна, а засеянае ўжо поле без мала зусім зністожэна праз вайну. Што да яравых пасеваў, то яшчэ горэй, бо ў перэлічэных аколіцах ніхто ўжо не мае на сяўбу збожа, не хапае рук рабочых і упражы.—«Kur. Warsz.» пішэ, што лічба зьнішчэных у Польшчы сяліб больш як 50,000, а лічба спаленых будынкоў больш як 150,000.

У **Галіччыне.** Генерал губэрнатар Галіччыны загадаў гарадзкому упраўленьню горада Львова зьбіраць у карысьць расейскай казны падаткі за другое паўгода 1914 г. разам с прыпадаючымі за гэты час гміннымі (валасньмі) прыбаўкамі. — Маскоўскіе манархісты маняцца устроіць з'езд «ўсерасейскаго саюза русскаго народа» у адным з горадоў Галіччыны. На з'ездзі паміж іншым будзе разьбірацца справа аб адносінах да палякоў, украінцоў і жыдоў. — 14 лістапада выехаў у Расею трэцьці гурт (группа) галічанскіх сірот, лікам 90 хлопчыкоў і дзеўчынак, высланых у Харков у прыют архіепіскопа Антонія.

# Аб усім па троху.

**Мох для перэвязак.** Доктар Якубоўскі, заведуючый лазарэтам гр. Бобрынскіх у Сміле, першы прыдумаў, як замяніць вату стасоўна прыладжэным мохам асаблівай пароды «sphagnum». Гэты мох высушаны, але крыху яшчэ вільготны, зашываецца у тонкае палатно і прыкладаецца да раны. Такая перэвязка якобы ня горшая і ад іншых.

**«Румяны крыж».** Коні, раненые на полі бітвоў, такой самай у англічан акружаюцца апекай, як і людзі. Ў Лёндыне наладжэно асаблівае таварыство для догляду коней. Часта-густа з небаспечнасьцю для жыцьця члены таварыства выратоўваюць пацярпеўшую жывёлу. Забітых коней яны палюць, раненых да паўсьмерці, якіх ня можна ужо вылечыць, яны прыстрэліваюць. Называецца таварыство — «Румяны Крыж». Бальніцы «Румянаго крыжу» паналаджываны цяпер па ўсей Англіі.

**Сабакі у нямецкай арміі.** На ваеннай службе у нямецкай арміі знайходзіцпа 37,000 сабак. Усе гэтые сабакі спаўняюць у арміі санітарную службу. Пасьля бітвы яны вышуківаюць раненых і паведамляюць аб іх санітароў. Апрача таго, сабакі высочываюць праціўніка і стаяць на варце. Пры такіх вартаўніках салдаты могуць спаць спакойна. Сабакі ворага не патпусьцюць. Затым сабакі спаўняюць абавязкі почтальёноў. Цераз іх перэсылаюцца важные паперы, данесеньня, і прыказы са штабу на пярэдніе пазыціі і назад. Расейскі «Чырвоны Крыж» так сама маніцца завясьці сабак для санітарнай службы.

**Новы цэркоўны год.** Ад 1-го верэсьня пачаўся новы цэркоўны год. Такога цэркоўнаго году ня было ўжо даўным-даўно. Вялікдзень будзе 22 марца, што па календарных вылічэньнях бывае раз у 500 гадоў. Сёлята неперaноснае сьвята Срэценьне (Грамніцы) робіцца пераносным і пераходзіць на 1-е лютаго, дзеля таго, што іначэй яно бы выпало у панядзелак вялікаго посту.

Рэдактар-Выдавец
**І. Луцэвіч.**

Выйшоў з друку
**„БЕЛАРУСКІ КАЛЕНДАР"**
**на 1915 год.**
двумя асобнымі выданьнямі, з асобным тэкстам рускімі літэрамі і з асобным тэкстам лацінскімі літэрамі.
**Выпісываць з „Беларускай Кнігарні", Вільня Завальная 7.**
Кнігарня просіць прысылаць заказы на календар загадзя, бо у гэтым гаду на палавіну меней друкавана календара і ён хутка разойдзецца. **Цэна без перасылкі 10 к.**
*На пробу календары не высылаюцца.*

Друкарня Марціна Кухты, Татарская 20.